# Экатурызму быць?

Як зрабіць запаведныя тэрыторыі цікавымі для наведвальнікаў, а мясцоваму насельніцтву даць магчымасць палепшыць свой дабрабыт?

**Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі ўдзельнікі міжнароднай канферэнцыіі «Новыя падыходы і паспяховыя практыкі ў развіцці экалагічнага турызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях як унёсак у дасягненне Мэтаў устойлівага развіцця».**

### Каштоўныя тэрыторыі

Мерапрыемства прайшло пры падтрымцы праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Развіццё экалагічнага турызму для садзейнічання «зялёнаму» пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту». Канферэнцыя сабралаў гібрыдным фармаце болын за 170 экспергаў у сферы экатурызму з 11 краін — Беларусі, Арменіі, Азербайджану, Эстоніі, Германіі, Казахстану, Малдовы, Расіі, Славакіі, Таджыкістану і Узбекістану. У ліку ўдзельнікаў былі эколаг!, прадстаўнікі прыродных заказнікаў, нацыянальных паркаў, НДА, аграэкасядзіб і ВНУ.

Падчас адкрыцця мерапрыемства міністр прыродных рэсурсаў і аховы наваколыіага асяроддзя Андрэй Худык адзначыў што прырода — адно з галоўных багаццяў Беларуси і сярод усіх экасістэм найвялікшую каштоўнасць маюць асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі (ААПТ). Менавіта гэтыя ўнікальныя аб’екты найболын цікавыя для развіцця экалагічнага турызму.

— Гэты перспектыўны кірунак закладзены ў Нацыянальную стратэгію развіцця сістэмы ААПТ да 1 студзеня 2030 года, зацверджаную Урадам Рэспублікі Беларусь, — адзначыў міністр.

Па яго словах, экалагічны турызм — гэта інсгрумент для павышэння ўзроўню ведаў пра важнасць прыроднай спадчыны, які садзейнічае захаванню натуральных экасістэм. Таксама ён валодае значным патэнцыялам для ўстойлівага развіцця рэгіёнаў, паляпшэння дабрабыту мясцовага насельніцтва, з’яўляецца адным з кірункаў «зялёнай» эканомікі і такім чынам робіць значны ўнёсак у дасягненне Мэтаў устойлівага развіцця.

Андрэй Худык расказаў, што на асабліва ахоўных тэрыторыях узрастае папулярнасць правядзення экалагічных фестываляў, а Бярэзінскі біясферны запаведнік і нацыянальныя паркі сталі турыстычнымі брэндамі. Цяпер справа за рэспубліканскімі і мясцовымі заказнікамі, якія могуць павялічваць разнастайнасць і якасць экатурыстычных паслуг, фарміраваць «зялёныя» маршруты, уладкоўваць экалагічныя сцежкі, ствараць паўнавартасны экатурыстычны прадукт.

У краіне распрацаваны 45 экалагічных сцежак і176 турыстычных «зялёных» маршрутаў,
116 турыстычных стаянак.

### Як прывабіць гасцей?

Падчас канферэнцыі сваім вопытам і лепшымі пракгыкамі ў сферы развіцця экалагічнага турызму на асабліва ахоўных тэрыторыях падзяліліся прадстаўнікі з розных краін.

Так, дырэктар Нацыянальнага парка «Себежскі» Надзея Падаплёкіна (Расія) расказала, як прыцягваюцца турысты на тэту запаведную тэрыторыю. У 2020 годзе была распрацавана новая — экалагічнай асветы і турызму з кластарным падыходам. У аснове — знаёмства гасцей з нацпаркам праз дзевяць ключавых пра-фесій: арнітолага, паляўніцтвазнаўцы, іхтыёлага, пчаляра, вучонага і іншых. Для гэтага ствараюцца тэматычныя музеі, эколага-асветніцкія зоны, экасцежкі.

Святлана Бялова, дырэктар Асацыяцыі для аховы прыроды «Махаон Інтэрнэйшэнэл» (Славакія), падзялілася вопытам стварэння праграмы партнёраў у Нацыянальным парку «Гесойзэ» ў Аўстрыі, мэтаякой — устойлівае развіццё рэгіёна, падтрымка дробных вытвор-цаў і

прадпрымальнікаў. Быў распрацаваны новы брэнд нацпарка, які выкарыстоўваюць усе арганізацыі-партнёры. Азаместаднаго інфармацыйнага цэнтра натэрыторыі ва-кол парка існуюць 100 маленькіх, дзе простыя людзі расказваюць гасцям нра гэтыя мясціны. За апошнія пяць гадоў турысты сталі на 23 % болыи праводзіць ноч у нацпарку.

Пра тое, як развіваецца турызм у Бярэзінскім біясфер-ным запаведніку, расказала намеснік дырэктара па туры-зме гэтай установы Алена Альшэўская. У апошнія гады тут быў створанві Цэнтр міфалагічнага турызму з музеем славянскай міфалогіі і сцежкай «У свеце міфаў», праводзіцца фестываль «Шлях Цмока». Экалагічныя веды пе-радаюцца праз прызму беларускай міфалогіі, якая вучыць чалавека дружалюбнаму суіснаванню з прыродай.

На тэматычных секцыях эксперты ацэньвалі, наколькі экалагічны турызм з'яўляецца важным элементам кіравання ААПТ, а таксама ці дапамагае ён устойліва развіваць рэгіёны. Абмяркоўвалі і асноўныя праблемы, якія сёння датычацца развіцця экатурызму.

Экалагічны турызм — гэта адказнае падарожжа ў прыродныя раёны, якое садзейнічае ахове прыроды, падтрымлівае дабрабыт мясцовага насельніцтва, а таксама ўключае інтэрпрэтацыю і адукацыю.

**Час змяняцца**

Важкі ўнёсак у арганізацыю канферэнцыі зрабіў праект «Развіццё экалагічнага турызму для садзейнічання «зялёнаму» пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту», які рэалізуецца ПРААН сумесна з Мінпрыроды пры фінансавай падтрымцы Расійскай Федэрацыі.

Аляксандра Салаўёва, пастаянны прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь, адзначыла, што рэалізацыя сумеснага праекта садзейнічае ўстойліваму эканамічнаму росту, стварэнню працоўных месцаў, забеспячэнню гендэрнай роўнасці і пашырэнню правоў і магчымасцяў жанчын, жыхароў сельскіх раёнаў, а таксама захаванню прыродных рэсурсаў і экасістэм, развіццю партнёрства ў інтарэсах устойлівага развіцця.

— Сёння ўнёсак турызму ў эканоміку Беларусі складае 2,5 % ВУП, — падкрэсліла яна. — Мы спадзяёмся, што праект будзе садзейнічаць дасягненню нацыянальных планаў па яго павелічэнні да больш чым 3% да 2035 года.

**Турызм супраць каранавіруса**

Пандэмія COVID-19 моцна паўплывапа на турыстычную галіну ў свеце, у тым ліку і ў Беларусі. Знізіліся знешнія турыстычныя патокі, упапі аб'ёмы выручкі ўнутранага турызму. Пры гэтым пандэмія паказала: прыродныя тэрыторыі, дзе даволі развітая інфраструктура, больш выйграюць у такой сітуацыі. Таму іншым за-казнікам важна шукаць і ўкараняць новыя бізнес-мадэлі ў сферы турызму, уключаючы стварэнне рэгіянальных турыстычных кластараў. У рамках праекта МТД будуць створаны тры такія кластары.

**Лічбавая трансфармацыя**

Ва ўмовах кавідных абмежаванняў стаў асабліва запатрабаваным віртуальны турызм. Ён дапамагае знаходзіцьальтэрнатыўныя спосабы падарожнічаць па свеце і новыя кірункі развіцця галіны.

Падчас рэалізацыі праекта будуць распрацаваны віртуальныя туры, электронныя даведнікі з лічбавымі GPS-навігатарамі і іншыя рашэнні, якія зробяць пада-рожжы інтэрактыўнымі і дазволяць адпраўляцца ў вір-туальныя прагулкі па заказніках з розных куткоў свету.

**Павялічыць інклюзіўнасць**

Паводле даных СААЗ, сёння каля 15 % жыхароў планеты — людзі з інваліднасцю, і гэта лічба пастаянна расце. Такія падарожнікі становяцца ўсё больш маса-вай турыстычнай аўдыторыяй.

У рамках праекта будзе палепшана інфраструктура заказнікаў, каб зрабіць яе больш даступнай для інклюзіў-ных турыстаў. Пройдзе таксама шэраг трэнінгаў для прадстаўнікоў прыродаахоўных

устаноў, мясцовых жы-хароў, прадпрымальнікаў, рамеснікаў і іншых па сацы-яльнай адказнасці і стварэнні роўныхмагчымасцяўдля наведвання ААПТ людзьмі з інваліднасцю.

**Новыя магчымасці для жанчын**

Праект зробіць унёсак і ў забеспячэнне гендэрнай роўнасці і пашырэнне правоў і магчымасцяў жанчын. Паводле даных Сусветнай турысцкай арганізацыі, сёння ў свеце яны складаюць большую частку занятых у сферы турызму — 54 %. У жанчын у рэгіёнах Беларусі з’явіцца магчымасць прайсці навучанне і стаць сертыфікаваным гідам-экскурсаводам, аўгаспадынь аграсядзіб — навучыцца весці адказны бізнес у сферы турызму.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА**
**Фота аўтара**